**БУКВАР** (ад літар старaславянскага алфавіта «буки» і «веди») – вучэбны дапаможнік для першапачатковага навучання грамаце.

Да з'яўлення Буквара доўгі час грамату асвойвалі па кнігах рэлігійнага характару. У перыяд Сярэднявечча вялікую асветніцкую функцыю выконвала Біблія, выдадзеная Ф. Скарынам.

У 1574 г. у Львове І. Фёдараў упершыню выдаў кнігу пад назвай “Азбука”. У 1593 г. у Вільні ў друкарні братоў Л. і К. Мамонічаў выйшаў Буквар “Начало учениа детем” Л. і С. Зізаніяў, а ў 1596 г. у Брацкай друкарні азбука гэтых жа аўтараў “Наука ку чтению и розумению письма словенского”. У 1906 г. у Пецярбургу было выдадзена “Першае чытанне для дзетак беларусаў” Цёткі (А. Пашкевіч). У кнізе даваліся кароткія звесткі пра асобныя гукі, прыводзілася іх літарнае абазначэнне, а таксама прапаноўваліся для чытання казкі, апавяданні, вершы, прыпеўкі і інш. творы.

З 1929 па 1969 г. у школах Беларусі карысталіся Букваром, складзеным Н. Сіўко (1929-1932 гг. з Лукіной, 1937-1941 гг. з З. Ліхачовай). У аснову навучання грамаце ў гэты час быў пакладзены гукавы аналітыка-сінтэтычны метад.

З 1969 г. вучні беларускіх школ навучаюцца грамаце па Буквары, створаным А. Клышкам.